# Да 110-годдзя з дня нараджэння С. А. Умрэйкі, вучонага ў галіне педагогікі (1908—1978)

*К. Д. Варанько,*
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Адзін з вядучых вучоных-педагогаў **Сцяпан Андрэевіч Умрэйка** шмат зрабіў для стварэння і развіцця агульнаадукацыйнай беларускай школы.

Нарадзіўся ён 19 снежня 1908 года ў в. Пясочнае Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігадовай школы паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум. З 1928 года працаваў настаўнікам у в. Пясочнае. Дзякуючы намаганням С. А. Умрэйкі і яго калег вёска стала адным з першых культурных цэнтраў раёна. Тут пабудавалі новае памяшканне школы-сямігодкі, адкрылі клуб, хату-чытальню. Школа доўгія гады была ў ліку лепшых школ раёна. У 1930 годзе С. А. Умрэйка пераехаў у Мінск, працаваў у райкаме камсамола, рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», настаўнікам, намеснікам дырэктара, дырэктарам сярэдняй школы. У 1939 годзе быў назначаны начальнікам упраўлення сярэдніх школ Народнага камісарыята асветы БССР. У 1941 годзе завочна скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на фронце.

Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 годзе С. А. Умрэйка прымаў актыўны ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі і ўстаноў адукацыі. Быў назначаны першым намеснікам наркама Народнага камісарыята асветы БССР. Ён разгарнуў актыўную дзейнасць па будаўніцтве і арганізацыі школ, забеспячэнні іх вучэбнымі дапаможнікамі і метадычнымі распрацоўкамі, падрыхтоўцы і падборы педагагічных кадраў.

З 1948-га па 1952 год С. А. Умрэйка ўзначальваў Навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства асветы БССР (праіснаваў да 1990 г.). У 1952 годзе абараніў дысертацыю на тэму «Очерки по истории советской общеобразовательной школы в БССР (1920—1941 гг.)» на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук. У гэтым жа годзе прызначаны намеснікам Міністра Міністэрства асветы БССР (на гэтай пасадзе працаваў да 1964 г.). Работу ў міністэрстве сумяшчаў з педагагічнай дзейнасцю ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага і Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна (БДУ). З 1964-га па 1972 год С. А. Умрэйка загадваў кафедрай педагогікі і псіхалогіі БДУ, у 1972 годзе стаў прафесарам. Адначасова з 1967-га па 1974 год працаваў прарэктарам па вучэбнай рабоце БДУ. У 1968 годзе стаў членам-карэспандэнтам Акадэміі педагагічных навук СССР. У апошнія гады сваёй дзейнасці з'яўляўся прафесарам-кансультантам кафедры педагогікі БДУ.

Навуковыя працы С. А. Умрэйкі прысвечаны станаўленню і развіццю агульнаадукацыйнай школы, гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Ім напісана больш за 300 навуковых работ. Сярод іх — «Состояние народного образования в БССР и осуществление закона о перестройке школы» (1961), «Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі» (у суаўтарстве, 1968), «Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов» (у суаўтарстве, 1980) і інш. Таксама С. А. Умрэйка падрыхтаваў 4 дактароў і 22 кандыдатаў педагагічных навук. З'яўляўся членам рэдкалегіі Беларускай савецкай энцыклапедыі, членам прэзідыума Рэспубліканскага таварыства «Веды», членам вучэбна-метадычнага савета Міністэрства асветы БССР, намеснікам старшыні Рэспубліканскага савета па кардынацыі навукова-даследчых работ па педагагічных навуках, членам экспертнай камісіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі СССР, старшынёй Савета БДУ па абароне дысертацый і прысуджэнні вучоных ступеней па філасофскіх і гістарычных навуках. Вучоны выступаў з лекцыямі перад настаўніцкай аўдыторыяй у многіх гарадах Беларусі. Выбіраўся дэлегатам Усесаюзнага з'езда настаўнікаў. Неаднаразова С. А. Умрэйка прадстаўляў нашу краіну на міжнародных канферэнцыях па праблемах адукацыі. У 1971 годзе стаў заслужаным настаўнікам БССР. Імя С. А. Умрэйкі прысвоена Песачанскай сярэдняй школе Капыльскага раёна. Ён узнагароджаны баявымі і працоўнымі ордэнамі і медалямі СССР, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

*Працы С. А. Умрэйкі*

**Состояние** народного образования в БССР и осуществление закона о перестройке школы : (материал для докладчиков и пропагандистов) / С. Умрейко. — Минск : ИНТИП, 1961. — 37, [1] с.

**Нарысы** гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / [С. А. Умрэйка і інш.] ; рэдкал. : С. А. Умрэйка (гал. рэд.) [і інш.] ; Навук.-дservед. ін-т педагогікі М-ва асветы БССР. — Мінск : Народная асвета, 1968. — 621 с. : іл., партр.

**Патриотизм** учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов / С. А. Умрейко, А. И. Залесский, П. Н. Кобринец. — Минск : БГУ, 1980. — 172, [2] с., [4] л. ил., портр.

*Аб жыцці і дзейнасці педагога*

Умрэйка Сцяпан Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 2003. — Т. 16. — С. 232.

Умрейко Степан Андреевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. — Минск, 2008. — Т. 7. — С. 320.

*Наумович, В. А.* Династия Умрейко : создатель педагогической школы // Судьбою связаны с БГУ / В. А. Наумович [и др.] ; под общ. ред. Р. П. Попка. — Минск : БГУ, 2016. — С. 37—43.

Педагогическое наследие С. А. Умрейко и современные проблемы педагогики : материалы Респ. науч.-практ. конф., посвящ. 90-летию С. А. Умрейко, Минск, 14 янв. 1999 г. / редкол. : А. П. Сманцер (отв. ред.), С. А. Пуйман, З. М. Титок. — Минск : БГУ, 1999. — 155, [1] с.

*Ольшевская, Н. В.* У истоков белорусской педагогики / Н. В. Ольшевская // Личность педагога / Н. В. Ольшевская. — Минск, 2011. — С. 5—6.

Умрэйка Сцяпан Андрэевіч // Гонар і слава Капыльшчыны : навук. дзеячы / [склад. : Н. У. Холад, Н. А. Гурло]. — Капыль, 2000. — С. 36—37.

*Жук, О. Л.* Степан Андреевич Умрейко : (к 100-летию со дня рождения) / О. Л. Жук, Н. А. Березовин // Веснік БДУ. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 2008. — № 3. — С. 89—91.

*Яленскі, М. Г.* Выдатны арганізатар асветы і вучоны-педагог : да 100-годдзя з дня нараджэння С. А. Умрэйкі (1908—1978) / М. Г. Яленскі // Веснік адукацыі. — 2008. — № 12. — С. 71—72.

*Титок, З. М.* С. А. Умрейко — белорусский педагог : (90 лет со дня рождения) / З. М. Титок // Адукацыя і выхаванне. — 1999. — № 1/2. — С. 87—89.